З ДНЁМ ПЕРАМОГІ

Ён прызнаўся, што не хоча, каб яго дзеці і дзеці ўсіх беларусаў ваявалі. «Місія мая і тых, хто побач са мной, у тым, каб мы маглі адказаць на любую пагрозу», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. У гэтым, па яго словах, у нас ёсць прыклад — ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якіх засталося сярод нас зусім няшмат. Прыклад тых, хто аднаўляў краіну ў першыя пасляваенныя гады, бедныя, аслабелыя. «Мы гэта не павінны забываць. Як толькі забудзем, да нас гэта бяда прыйдзе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт выказаў словы ўдзячнасці вызваліцелям Беларусі, якія жывуць у розных кутках свету. «Вы — родныя людзі. Што б ні адбывалася і як бы ні ставіліся да Перамогі там, дзе вы сёння жывяце, беларуская зямля памятае вас і дзякуе вам, — сказаў ён. — Вечная слава гераічнаму подзвігу народаў Савецкага Саюза, якія разам прайшлі праз вогненнае ліхалецце вайны і перамаглі нацызм».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў ветэранам, тым, хто аднаўляў нашу краіну міру, дабра, дабрабыту і шчаслівага жыцця толькі пад небам свабоднай Беларусі.

**У тэму**

**ЗАБУДЗЕМ САЛДАТ ВАЙНЫ — БУДУЧЫНІ Ў НАС НЕ БУДЗЕ**

Усяго ў Беларусі вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» ўзнагароджаны 36 населеных пунктаў: 27 у адпаведнасці з указам ад 6 кастрычніка 2004 года (у 60-ю гадавіну вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў), калі і была заснавана ўзнагарода, і дзевяць — па ўказе ад 2 лютага 2024 года, да 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сёлета ўзнагароды ўдастоены гарады Баранавічы, Дзяржынск, Дзятлава, Калінкавічы, Любань, Асіповічы, Чавусы, гарадскія пасёлкі Обаль і Асвея. Прэзідэнт уручыў адпаведныя ганаровыя граматы прадстаўнікам кіраўніцтва гэтых населеных пунктаў.

Прадстаўнікі гэтых населеных пунктаў зрабілі журналістам невялікі экскурс у мінулае свайго краю і расказалі, як увекавечваецца гераічная памяць. Міхаіл Слесарэнка, старшыня Асіповіцкага раённага савета ветэранаў, адзначыў, што ўручэнне вымпела — яшчэ адзін напамін і доказ таго, што трэба берагчы мір на зямлі і рабіць для гэтага ўсё. «Мы ўдзячны нашаму Прэзідэнту, які заўсёды стаяў гарой за мір і заўсёды ўсім нагадваў, што наш народ мірны. І мы пастараемся абараніць мір на нашай зямлі», — сказаў ён. Паводле слоў Міхаіла Слесарэнкі, у Асіповіцкім раёне засталіся два ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Ім аказваецца ўся неабходная ўвага, павага і клопат. «Мы разумеем, што мы, старэйшае пакаленне, дзеці ветэранаў, павінны перадаць дзецям, будучым пакаленням гэтую памяць, навучыць іх гэтак жа як берагчы і захоўваць. Цяпер уся надзея толькі на іх», — падкрэсліў Міхаіл Слесарэнка.

Анатоль Вінкевіч, старшыня Чавускай раённай ветэранскай арганізацыі, падкрэсліў, што Дзень Перамогі быў, ёсць і будзе найважнейшым святам. І гэта несумненна, асабліва цяпер. «Чавускі раён, які я прадстаўляю, падчас вайны пацярпеў вельмі моцна. На нашай тэрыторыі дзевяць месяцаў стаяў фронт. Да вайны ў Чавускім раёне жыло звыш 50 тысяч чалавек, пасля вайны засталося менш за 30», — распавёў ён. Зусім нядаўна ў Чавускім раёне адкрылі мемарыял загінулым на рацэ Проні. Акрамя дзяржаўнай падтрымкі, грошы на стварэнне мемарыяла збіралі і неабыякавыя людзі. «Памяць аб салдатах Вялікай Айчыннай вайны павінна жыць вечна і быць прыкладам для нашай моладзі. Калі мы іх забудзем — будучыні ў нас не будзе», — запэўніў Анатоль Вінкевіч.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «НАША КРАІНА ДАСЯГНУЛА ТАКОГА ЎЗРОЎНЮ, КАЛІ НАШЫ ЛЮДЗІ ПАКАРАЮЦЬ КОСМАС»

## Марыну ВАСІЛЕЎСКУЮ сустракалі ў Савеце Рэспублікі

**У сустрэчы таксама ўдзельнічалі члены Прэзідыума і Савета старэйшын верхняй палаты парламента. Першы касманаўт суверэннай Беларусі падзялілася дэталямі падрыхтоўкі і ажыццяўлення касмічнага палёту. Старшыня Савета Рэспублікі, у сваю чаргу, расказала, як беларусы сачылі за гэтай найважнейшай для краіны падзеяй, праінфармавала аб асаблівасцях работы сенатараў: заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці, рабоце з насельніцтвам.**

«Вядома, як сказаў правільна Аляксандр Рыгоравіч, мы сталі касмічнай дзяржавай, гэта вельмі важна, — адзначыла спікер верхняй палаты парламента. — Казаць аб тым, што мы не займаліся космасам, будзе няправільна. Мы працавалі шмат. Нашы землякі-беларусы — касманаўты, і мы гэтым ганарымся. Але ў гісторыі суверэннай і незалежнай Беларусі вы — першая касманаўтка, якая пакарыла космас. Нам, жанчынам, удвая прыемна, што гэта жанчына. Жанчына, якая пабывала ў космасе».

Па словах Наталлі Качанавай, многія назіралі за тым, як стартаваў касмічны карабль, перажывалі, як праходзіў увесь касмічны палёт. «Вядома, перажывалі і тады, калі было прызямленне, бо ўсе зноў паглыбіліся ў космас, чыталі, якія этапы самыя складаныя, — расказала спікер. — Вы з такой чароўнай усмешкай, калі было прызямленне... Гэта было такое захапленне. Я падумала: вось, што для нас важна. Важна, што сёння наша краіна дасягнула такога ўзроўню ў сваім развіцці, калі нашы людзі пакараюць космас, што такія прыгожыя дзяўчаты пабывалі ў космасе, правялі там пэўную работу, якая была запланавана».

Марына Васілеўская падкрэсліла, што для яе высокі гонар знаходзіцца ў Савеце Рэспублікі. Герой Беларусі падзялілася сваімі ўражаннямі ад касмічнага палёту, планамі на будучыню.

«Падрыхтоўка была нялёгкая, яна праходзіла дзесьці восем месяцаў, — расказала касманаўт. — Было нялёгка ўпісацца, бо гэта не маё асяроддзе, я нічога гэтага не вывучала. Касмічная тэма — для мяне новая, але вельмі цікавая».

Марына Васілеўская падзялілася, што з дзяцінства марыла быць настаўнікам, аб космасе ніколі не думала. «Калі ўжо пайшла працаваць у авіякампанію «Белавія», знайшла сябе ў гэтай прафесіі, — падзялілася першая касманаўтка суверэннай Беларусі. — Вядома, было страшна. Але дзякуючы сваёй рабоце я зразумела, што трэба выходзіць з зоны камфорту, пераадоленне пэўных перашкод узвышае нас. Трэба імкнуцца да большага, і тады сапраўды ўсё атрымаецца».

Касманаўтка расказала, як праходзіў адбор (разглядалася тры тысячы заявак). Па яе словах, гэта было своечасова, бо пэўных прафесійных вышынь Марына Васілеўская ўжо дасягнула і хацела развівацца далей, вышэй. «Вышэй аказаўся толькі космас, і гэта, вядома, нешта неверагоднае, — падкрэсліла яна. — З радасцю прыняла гэтую прапанову і прайшла ўсе этапы падрыхтоўкі, праверкі, медыцынскае абследаванне было вельмі сур'ёзнае. Удзячна бацькам за такія гены, за маё здароўе. Вяду здаровы лад жыцця».

Марына Васілеўская расказала, што падчас падрыхтоўкі да касмічнага палёту ёй пашанцавала працаваць з выдатнай камандай, таму спраўляцца з пастаўленымі задачамі было нескладана. Чаго не скажаш пра пасадку. «Пасадка была жорсткая», — падзялілася касманаўтка. Аднак у космасе, нягледзячы на перасцярогі калег, яна адчувала сябе добра.

У завяршэнні сустрэчы Наталля Качанава падарыла Марыне Васілеўскай ляльку-касманаўта ручной работы і ўручыла іншыя падарункі.

У размове з журналістамі Марына Васілеўская выказала ўдзячнасць Старшыні Савета Рэспублікі за запрашэнне пабываць у верхняй палаце парламента. «Было вельмі прыемна пагутарыць з Наталляй Іванаўнай, членамі Прэзідыума, абмеркавалі пытанні майго палёту, пацікавіліся маім самаадчуваннем — была вельмі добрая, душэўная размова, — падкрэсліла Герой Беларусі. — Рыхтуюся да грамадскай дзейнасці. Хачу наведаць шмат нашых дзяржаўных арганізацый, школ, садкі. Усе чакаюць. З вялікім задавальненнем хачу падзяліцца сваім досведам, настроем, задаць добры настрой хлопцам і дзяўчатам, пажадаць ім усяго добрага, каб яны дасягалі сваіх мэт і імкнуліся да найлепшага».

Касманаўтка падзялілася, што не стамілася адказваць на адны і тыя ж пытанні пра космас. «Усё, што я раблю, раблю ад душы, мне гэта падабаецца, — падзялілася яна. — Мне здаецца, ад гэтага немагчыма стаміцца. Цудоўна расказваць аб космасе, нашай зямлі, папулярызаваць космас. Хачу сказаць, каб усе любілі і цанілі нашу Радзіму, нашу Зямлю. Сапраўды толькі, напэўна, з космасу бачыш, якая яна маленькая, далікатная. У космасе я адчувала гонар за нашу краіну».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВЫЗВАЛЕННЮ БЕЛАРУСІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

## У БДЭУ прайшла дыктоўка па матэрыялах «Звязды» пра аперацыю «Баграціён»

**«Дзень нашай памяці і ўдзячнасці». Так называўся тэкст сёлетняй агульнаўніверсітэцкай дыктоўкі па беларускай мове, якая прайшла ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце. За яе аснову ўзяты тэксты газеты «Звязда» пра аперацыю «Баграціён» — адну з найбуйнейшых вайсковых аперацый у сусветнай гісторыі. Агучыў тэкст Руслан ЧАРНЕЦКІ, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы.**

Дыктоўка была падрыхтавана кафедрай беларускай і рускай моў факультэта міжнародных бізнес-камунікацый. **Загадчык кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Вольга ГУБСКАЯ** распавяла, што такая дыктоўка ўжо стала добрай традыцыяй Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

— Звычайна мы праводзім яе ў лютым — святкуем Міжнародны дзень роднай мовы. Але гэты год знакавы для нашай краіны. Менавіта сёлета адзначаецца 80-годдзе вызвалення Беларусі. А калі б не было Вялікай Перамогі, не было б і свята роднай мовы. Менавіта таму мы аб'ядналі дзве падзеі ў адну, і зразумела, што тэкст дыктоўкі прысвечаны падзеям вайны. А менавіта аперацыі «Баграціён», дзякуючы якой Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дарэчы, трэба адзначыць, што тэкст дыктоўкі складаўся па матэрыялах газеты «Звязда».

Чаму менавіта «Звязда» стала крыніцай тэксту? Вольга Губская прызналася, што наша газета — выданне, у якім заўсёды можна знайсці якасны матэрыял пра культурныя падзеі краіны, адсылкі да гістарычнага мінулага. За публікацыямі «Звязды» на кафедры сочаць, вось і знайшлі на старонках прыдатны матэрыял.

У зале, якая была цалкам запоўнена, прычым на дыктоўку прыйшлі як студэнты, так і выкладчыкі, стварылі адпаведную атмасферу з дапамогай музыкі. Прагучала цымбальная версія вядомай усім песні «Смуглянка», якая перанесла ў ваенныя гады. Удзельнікаў дыктоўкі прывіталі прарэктар па выхаваўчай рабоце Сяргей Скрыба і дэкан факультэта міжнародных бізнес-камунікацый Юлія Шаўрук.

Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага дэпутат Палаты прадстаўнікоў Руслан Чарнецкі ў сваім слове перад дыктоўкай прызнаўся, што з задавальненнем згадзіўся ўзяць удзел у гэтым мерапрыемстве, хаця прыйшлося адпрошвацца з рэпетыцыі. Тэму дыктоўкі артыст лічыць вельмі важнай. Руслан Чарнецкі зачытаў пра гэта вершаваныя радкі:

«Навекі слава тым, хто ў полі ратным
Загінулі за родныя палі,
За свой народ, за лёс народаў братніх,
За дзень наступны ўсяе зямлі».

Дэпутат прапанаваў ушанаваць хвілінай маўчання ўсіх, хто аддаў жыццё за Вялікую Перамогу, хто вызваляў нашу краіну.

Пасля хвіліны маўчання пачалася дыктоўка. Усе вельмі стараліся, часам задумваліся, а вось спісваць сэнсу не было: мэта не атрымаць добрую адзнаку, а праверыць свае веды ў роднай мове і прапусціць праз сябе карысную інфармацыю, закладзеную ў тэксце. А тэкст заканчваўся такім фрагментам: «Сімвалам народнага подзвігу савецкіх воінаў і партызан, загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, узвышаецца ў Мінску на плошчы Перамогі велічны помнік-абеліск. Гарыць і гарыць перад ім Вечны агонь — знак нашай памяці і ўдзячнасці героям, якія аддалі сваё жыццё дзеля мірнай будучыні. Праз дзесяцігоддзі, у сучаснай Беларусі, дзень 3 Ліпеня стаў галоўным дзяржаўным святам — Днём Незалежнасці».

Пасля заканчэння работы ўсе мелі магчымасць праверыць свае веды з дапамогай паўторнай чыткі і слайдаў на экране. А потым пачаўся дыялог з ганаровым госцем. Руслан Чарнецкі ахвотна адказаў на шматлікія пытанні. Вядома, напачатку прагучала пытанне пра тое, як акцёр наважыўся стаць дэпутатам.

— Я зразумеў, што галоўная мэта майго жыцця — дапамагаць людзям, — адказаў Руслан Чарнецкі. — Выкарыстоўваючы розныя шляхі. Як артыст я імкнуся дапамагчы гледачу стаць лепшым, даносячы словы класікаў. Калі чалавек становіцца кожны дзень крыху лепшым, гэта ж і ёсць шчасце! І якраз дэпутацкая пасада дае мне выдатную магчымасць дапамагаць людзям. Дэпутат жа не толькі законы піша, ён робіць шмат добрага, і не толькі для выбаршчыкаў са сваёй акругі. Для мяне гэта цудоўная магчымасць іншымі інструментамі дапамагаць людзям у жыцці, не толькі праз сцэну. Менавіта таму я і вырашыў пайсці па гэтым шляху. Лічу, што ў мяне гэта атрымаецца — і ўжо атрымліваецца.

Спыталі ў госця, як удаецца сумяшчаць столькі розных відаў дзейнасці: іграць у тэатры, здымацца ў кіно, займацца дэпутацкай працай... Руслан Чарнецкі адказаў, што галоўнае — шчырае жаданне нешта зрабіць, а яшчэ адказнасць і ўнутраная дысцыпліна. Цікавіла маладых, і як знайсці сябе, дасягнуць поспеху. У адказах Руслан Чарнецкі быў шчыры, распавёў, як у юнацтве сам шукаў сябе: па першай адукацыі ён аўтаслесар, адслужыў у арміі, працаваў афіцыянтам, ахоўнікам, займаўся спортам, танцаваў... Дарэчы, спорт з Русланам Іосіфавічам усё жыццё. Акцёр — кандыдат у майстры спорту па парусным спорце, сур'ёзна займаўся плаваннем, гуляў у футбол, баскетбол, валейбол, настольны тэніс, займаўся боксам і кік-боксінгам. Галоўнае — ён ніколі не спыняўся, не дазваляў сабе ленавацца і ўвесь час імкнуўся знайсці любімую справу, якой захочацца займацца ўсё жыццё. Бо калі ты займаешся любімай справай — ты шчаслівы чалавек, цябе не трэба гнаць на работу. Руслан Чарнецкі лічыць сябе шчаслівым. Таму і параіў маладым не спыняцца шукаць сябе, каб потым не пакутаваць на нелюбімай рабоце.

Распавёў госць і пра сваю сцэнічную работу — запрасіў не прапусціць новы спектакль Акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага «Горкі хлеб», дзе ён іграе. Спектакль таксама прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі.

— Гэта вельмі незвычайная пастаноўка. Прагучаць рэальныя гісторыі рэальных людзей, у якіх нічога не зменена. Гісторыі тых, хто ў дзяцінстве перажыў вайну. Мне гэта блізка. Я позняе дзіця, мая маці — 1939 года нараджэння, таму яна расказвала мне пра вайну гісторыі, падобныя да тых, якія мы сёння паказваем на сцэне. У нас шмат твораў пра герояў вайны, пра салдат, разведчыкаў... Але ці ўяўляем мы, што перажывалі ў той час маленькія дзеці, якім было пяць, сем, дзевяць гадоў? Гэта вельмі кранальны спектакль. Нават я, чалавек, які ведаў гэты матэрыял, рэпеціраваў яго, калі знаходзіўся на сцэне, ледзь стрымліваў слёзы. Спектакль дасць не толькі эмоцыі — прымусіць задумацца. Гэта для мяне і ёсць самае галоўнае.

Пасля размовы да госця выстраілася чарга па аўтографы, якія ў асноўным бралі на аркушыках з напісанай дыктоўкай. Хапала ахвотных і для фотасесіі з вядомым акцёрам і грамадскім дзеячам.

— Упэўнена, што тэкст дыктоўкі быў не толькі карысным для праверкі правапісу, але і інфарматыўным і пазнавальным, — зазначыла напрыканцы Вольга Губская. — Цікава было слухаць, як чытае тэкст акцёр Руслан Чарнецкі. Яго голас, расстаноўка акцэнтаў, інтанацыя сведчылі, што перад намі прафесійны артыст, які мог бы быць і добрым выкладчыкам. У любым выпадку, кантакт са студэнтамі быў знойдзены імгненна.

**Людміла ІВАНОВА.**